ку падняўшы завесу над таямніцай. Ікона прадугледжвае ўнутранае, духоўнае разуменне. Заходнееўрапейскія мастакі, наадварот, шукалі магчымасць выказаць нават у рэлігійным сюжэце прыгажосць рэальнага жыцця, сэнс зямнога існавання. Так, можна заўважыць па гэтых прыкладах, што беларускае «Дабравешчанне» гарманічна спалучыла і адно, і другое.


1. *Антонова, В. И.* Каталог древнерусской живописи XI – начала XVIII в. Опыт историко-художественной классификации: в 2 т. / В. И. Антонова, Н. Е. Мнёва. – М.: Искусство, 1963. – Т. 2. – 570 с.

2. *Библия.* – М.: Изд. Московской Патриархии, 1988. – 1376 с.

3. *Демус, О.* Мозаики византийских храмов. Принципы монументального искусства Византии / О. Демус; пер. с англ. Э. С. Смирновой; ред. и сост. А. С. Преображенский. – М.: Индрик, 2001. – 160 с.

4. *Земная* жизнь Пресвятой Богородицы / сост. С. Снессорева. – Ярославль: Норд, 2008. – 460 с.

5. *Маркелов, Г. В.* Книга иконных образцов: в 2 т. – 2-е изд., перераб. и доп. / Г. В. Маркелов.– СПб.: Изд. Ивана Лимбаха, 2006. – 584 с.

6. *Покровский, Н. В.* Евангелие в памятниках иконографии / Н. В. Покровский – М.: Прогресс-Традиция, 2001. – 564 с.



*Г. Ю. Емялёва, аспірант*
*БДУ культуры і мастацтваў.*
*Навуковы кіраўнік – А. І. Смолік,*
*доктар культуралогіі, прафесар*


## ПРАБЛЕМА ЗАХАВАННЯ І ВЫВУЧЭННЯ ТРАДЫЦЫЙНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЦАЦКІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ЛЯЛЬКІ)

Лялькі вядомыя чалавецтву са старажытных часоў. На тэрыторыі Еўразіі знаходзяць дробную антрапаморфную пластыку, створаную каля 40 тысяч год таму. Лялькі найбольш блізкія з аднаго боку язычніцкім ідалам і драўлянай народнай скульптуры, а з другога боку – маскіраваным удзельнікам рытуалаў. Аналогіі прасочваюцца таксама з антрапаморфнымі аброчнымі крыжамі і культавымі камянямі. У самым агульным сэнсе лялька – антрапаморфны аб’ект, створаны дзеля пэўных маніпуляцый. Усе лялькі можна ўмоўна падзяліць на абрадавыя і пазаабрадавыя, але першапачаткова лялькі ўзніклі і існавалі ў непасрэднай сувязі з сакральным.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нягледзячы на слабую даследаванасць беларускай традыцыйнай лялькі, нам вядомыя як абрадавыя (каляндарна-абрадавыя і сямейна-абрадавыя), так і пазаабрадавыя лялькі. Асобныя згадкі аб іх можна знайсці ўжо ў працах такіх этнографаў XIX – першай паловы XX ст., як П. А. Бяссонаў, Е. Р. Раманаў, А. К. Сержпутоўскі, М. А. Федароўскі, П. В. Шэйн і інш. У 80-я гг. XX ст. на беларускую народную цацку (у тым ліку і ляльку) як на твор народнага мастацтва Беларусі звярнуў увагу Я. М. Сахута, а на пачатку XXI ст. Т. І. Кухаронак разгледзела традыцыйную абрадавую ляльку ў якасці адпаведніка маскі ў беларускай каляндарнай абраднасці. Апошняй з'явілася праца С. У. Касцюкевіч, у якой этнолаг даследавала семантыку, асноўныя віды і функцыі беларускай дзіцячай цацкі.

Але ўсё ж традыцыйная беларуская лялька (як і цацка наогул) даследавана недастаткова. І гэта звязана ў першую чаргу з недахопам саміх матэрыялаў – абрадавыя лялькі часцей за ўсё знішчаліся падчас абраду (спальваліся, тапіліся, закопваліся, разбіраліся), а лялькі для гульні асабліва не захоўваліся ў сем'ях, бо былі недаўгавечныя і заўсёды можна было хутка і проста з падручных матэрыялаў зрабіць новую цацку.

Акрамя таго, беларускія музейныя зборы маюць толькі адзінкавыя экзэмпляры этнаграфічнай цацкі, за выключэннем керамічных свісцёлак, сабраных у асноўным у 2 пал. 20 ст. Аднак вядома, што асобныя адзінкі беларускай цацкі кан. 19. – пач. 20 ст. (у тым ліку і лялькі) маюць у сваіх калекцыях музеі Расіі, Польшчы, Літвы. Так, напрыклад, у вопісах Расійскага этнаграфічнага музея значацца лялькі з экспедыцыі А. К. Сержпутоўскага, сабраныя ў 1924 г. у в. Жываглодавічы (Мінская губ., Сенненскі пав., Вязнянская воласць) і в. Убібацька (Бабруйская акруга, Любанскі раён) (усяго 5 адзінак), а таксама лялькі з экспедыцый па Магілёўскай губерніі, Гомельскаму пав. Е. Р. Раманава (усяго 3 адзінкі) і інш.

Крыніцай для вывучэння традыцыйнай лялькі з'яўляюцца і ўнікальныя этнаграфічныя фільмы З. Я. Мажэйка і Р. С. Гамзовіч, знятыя ў розных рэгіёнах Беларусі ў 80–90-я гг. 20 ст., дзе можна пабачыць масленічныя, купальскія, вясельныя лялькі і звязаныя з імі абрады ў жывым бытаванні.

Але ўсё ж асноўным матэрыялам для вывучэння гэтай часткі традыцыйнай культуры беларусаў з'яўляюцца небага-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тыя тэкставыя апісанні і зрэдку фотаздымкі. У сувязі з гэтым, на наш погляд, актуальным і цалкам магчымым да гэтага часу з'яўляецца збор этнаграфічных матэрыялаў – саміх цацак і тэхнік іх стварэння дзеля пераймання і працягу традыцыі. Да гэтага часу мы можам казаць аб неабходнасці глыбокага і ўсебаковага даследавання традыцыйнай беларускай цацкі – з'явы цікавай і выключна архаічнай.

1. *Кухаронак, Т. І.* Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. І. Кухаронак. – Мінск: Ураджай, 2001. – 239 с.

2. *Народны* тэатр / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; уклад. і камент. М. А. Каладзінскага; уступ. арт. А. С. Фядосіка; рэд. выд. А. С. Фядосік, А. В. Сабалеўскі. – 2-е выд., выпр. і дапрац. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 554 с.

3. *Этнаграфія* Беларусі: энцыкл. / [навук. канс.: М. В. Біч [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – (Беларуская савецкая энцыклапедыя).

4. *«Пахаванне* стралы» – рэгіянальна-адметная абрадавая з'ява фальклору Усходняга Палесся (ч. 1) [Электронны рэсурс]. – Гомель, 2008–2009. – Рэжым доступу: http: //www.nashkraj.info. – Дата доступу: 22.02.2011.

*О. С. Жук, научный сотрудник*
*филиала НХМ РБ «Дом Ваньковичей.*
*Культура и искусство 1 пол. XIX века»*

## МАТРИМОНИАЛЬНАЯ СТРАТЕГИЯ БЕЛОРУССКИХ ДВОРЯН В XIX – НАЧАЛЕ XX ВЕКА (К ВОПРОСУ ИЗУЧЕНИЯ)

Тема матримониальной (т.е. связанной с браком) стратегии белорусского дворянства XIX – начала XX века на сегодняшний момент в Беларуси продолжает оставаться малоизученной, несмотря на отдельные статьи, изредка появляющиеся в научных сборниках [6]. Среди целого ряда причин, лежащих в основе подобной ситуации, особо хотелось бы выделить следующие.

Во-первых, вопрос брачного поведения привилегированного сословия **в целом** освещен слабо в современной белорусской научной литературе, вне зависимости от исследуемого периода. К примеру, матримониальное поведение шляхты в XVI–XVIII вв. (и, отчасти, XIX веке) хоть и затрагивается

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ